ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 52 (434) Пятніца, 13 мая 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Пяць гадоў юным піонэрам

Невялікая група дзяцей, распачаўшая сваю працу ў 1922 г. пад назваю „Юны Спартак“ у чэрвені 1923 г., налічвала 1286 ч., 32 атрадаў. Большая палова атрадаў з'арганізавалася ў Менску—7, астатнія ў павятовых гарадох.

Прашло пяць гадоў. Юныя піонэры імя Леніна, якія атрымалі сабе такую назву на VI Усерасійскім зьезьдзе комсамолу ў 1924 г., вырасьлі ў агромністую сілу.

Дзеці фабрык, заводаў, дзіцячых дамоў, мястэчак, глухіх далёкіх вёсак, сёл, хутароў, ведаюць піонэраў. Піонэраў цяпер у нас на Беларусі 77314 чал.

Піонэры ўжо змаглі навакол сябе з'арганізаваць малодшых дзяцей акцябрат, якіх налічваецца 9744 чал.

Хто ня ведае піонэраў? Піонэраў ведаюць старыя, іх ведаюць маленькія дзеці, якія толькі пачынаюць хадзіць. Часта бывае калі такі малы не дае спакою сваёй матцы: вядзі мяне ў піонэры і больш нічога. 3-х гадовы малыш на прывітаньне,—адказвае салютам. Піонэры—дзеці Кастрычніка—унесьлі новы струмень у сям'ю, паднялі бадзёрасьць, жвавасьць нашай школы.

Многа з тых піонэраў, якія ўступілі ў першыя гады ў організацыю, цяпер працуе на актыўнай комсамольскай рабоце: сакратарамі ячэек, агітпропамі, павадырамі нашых атрадаў і інш.

Піонэры рыхтуюць з сябе зьмену комсамолу, рыхтуюць новых грамадзян, ка практычным удзеле ў пасільнай дзецям працы ў гаспадарчым і культурным адбудаваньні нашай краіны.

На фабрыцы, заводзе—яны памоцнікі комсамолу, партыі, фабкому і мясцкому. У вёсцы—комсамолу, партыі, сельскаму савету, коопэратыву, камітэту сялянскай узаемадапамогі. У школе—першыя памоцнікі настаўнікам у організацыі дзяцей над вучобай.

Маючы гэта ў дзень 5 годзьдзя організацыі мы павінны адзначыць, што наперадзе работы яшчэ больш.

Нашы піонэры не адзін раз заяўлялі свайму павадыру атрада, што яны яшчэ ня зусім задаволены працай у атрадзе. Некаторыя выказвалі свой протэст нават выхадам з атраду.

Што-ж нам патрэбна, каб ажывіць нашу працу, зрабіць яе цікавай для кожнага піонэра.

Для гэтага патрэбна будаваць працу атраду, працу зьвяна самім піонэрам, абгаварваць кожную маленькую прапанову піонэра на зборах і на падставе іх уласных думак складаць пляны сваёй далейшай працы.

Кожны піонэр у атрадзе, павінен выконваць работу па яго сіле. Раней мы сваю працу будавалі на гутарках. Такія гутаркі нашым піонэрам надаядаюць, робяцца прыкрымі, а праз адны гутаркі бяз практычнай працы ня можна падрыхтаваць з сябе добрага працаўніка.

Таварыш Ленін, імя якога мы носім, казаў комсамолу, што падрыхтавацца да ўдзелу ў будаваньні нашай краіны можна толькі тады, калі кожны з нас будзе рабіць хоць маленькую карысную справу для грамады.

Мы цяпер пачынаем у нашых атрадах працаваць па заданьням. Заданьні могуць знаходзіць самі піонэры, пры дапамозе павадыра атраду і кожны піонэр павінен выконваць адну з частак такога заданьня па яго сілам.

Патрэбна каб работа атрадаў была жвавай, бадзёрай. З гэтай мэтай піонэры у атрадзе організуюць добра свой адпачынак. Ходзяць разам у кіно, купацца, на прагулку, экскурсыю, наладжваюць вечары, падбіраючы такія нумары, якія пажаданы дзецям, організоўваюць натуралістычную работу па вывучэньню жыцьця птушак, расьлін, праз групу ў атрадзе з жадаючых дзяцей, альбо праз гурток пры школе; організоўваюць пры клюбах музычныя гурткі, майстэрні. Піонэратрад дапамагае піонэрам у іх тэхнічнай дзейнасьці дома. Вясковы піонэр і атрад стараюцца палепшыць гаспадарку, навучыцца культурнаму вядзеньню гаспадаркі, для чаго пры школах атрады закладаюць сваі паказальныя градкі, агароды.

У нас, таварышы, цяпер яшчэ многа ёсьць бяспрытульных дзяцей, якія ня маюць сваіх сем'яў. Мінулая вайна заставіла многа сірот.

Кожны з нас павінен заўсёды клапаціцца аб гэтых дзецях. Нам трэба ўзмацняць працу таварыстваў „прыхільнікі дзяцей“, самім уступаць у гэтыя таварыствы, прыцягваць сваіх бацькоў. Прыцягваць і бяспрытульных у працу свайго атраду.

Свой 5-цёхгадовы юбілей і міжнародны дзіцячы тыдзень мы праводзім вольна. Нам дапамагаюць нашыя старэйшыя таварышы, комсамол, партыя і савецкая ўлада.

За межамі дзеці рабочых і сялян гэтага ня маюць. Там ім улада буржуяў не дапамагае, а душыць, заарыштоўвае, расстрэльвае бацькоў. У школах ужываюць кару, дурманяць законам божым.

Кожны з нас павінен ведаць аб жыцьці галадаючых дзяцей Польшчы, Заходняй Беларусі і Кітая і чым мага дапамагаць ім.

Цяпер, як ніколі ячэйкі комсамолу павінны дапамагаць, практычна кіраваць працай атраду.

Трэба раз назаўсёды палажыць канец няўважлівым адносінам да гэтае працы, палажыць канец безабразнаму зьявішчу, калі павадыры атрадаў мяняюцца амаль што кожны месяц.

Наш лёзунг—лепшых комсамольцаў на піонэрскую работу.

Цяпер, як ніколі, павінна быць наладжана сьціслая сувязь з культурнымі сіламі.

Наша гарачае комсамольскае прывітаньне дзецям рабочых і сялян капіталістычных краін!

Наша гарачае прывітаньне малодшым нашым братом юным піонэрам у дзень іх пяцігодзьдзя!

15-га мая—ВЯЛІКІ КАРНАВАЛ.

Гаррайком ЛКСМБ організуе 15-га мая масавы карнавальны паход, прысьве(—) чаны друку. У карнавале прымуць удзел выдавецтвы і рэдакцыі газэт. (—
Згодна пастановы бюро РК, усе ячэйкі ЛКСМБ Гарраёну, не занятыя ў гэты дзень на вытворчасьці, павінны прыняць удзел у дэмонстрацыі. Усе ячэйкі і піонэратрады павінны будуць узяць свае насьценгазэты і выйсьці з імі на дэмонстрацыю, прыстасоўваючы іх так, каб магчыма было насіць.

Ячэйкі, школы, піонэратрады другіх раёнаў, жадаючыя ўдзельнічаць у карнавале, павінны аб гэтым раней паведаміць Гаррайком ЛКСМБ.

Змагаемся супроць бюрократызму!

„Брат мой рубіць, а я адвожу“...

(Па матар'ялам РСІ).

Бюрократызм ня зусім цяжка зьнішчыць. У горадзе кожны факт бюрократызму, дрэнных адносін да грамадзян хутчэй прыкмячаецца. Зразу-ж аб гэтым паведамляюцца адпаведныя організацыі... Вядома, што і тут хібы ёсьць...

Але куды цяжэй зьнішчыць такія хваробныя зьявішчы ў вёсцы.

Тут ў першую чаргу неабходна больш рашучая дзейнасьць сялянскай моладзі. Не глядзець скрозь пальцы, а зразу-ж паведамляць органы РСІ бюро скаргаў і інш.



Вось такім чынам была раскрыта «бюрократычная» балячка глыбока засеўшая ў адным сельсавеце.

Дзякуючы аднаму селяніну, які напісаў аб гэтым у Цэнтральны Дом Селяніна, справа дайшла да РСІ. Было праведзена абсьледваньне сельсавету і прыняты належныя меры.

Уся гэтая трагэдыя разыгрывалася ў вёсцы **Сьвірані, Палюдаўскага сельсавету, Коханаўскага раёну, Аршанскай акругі.** Там ўпаўнаважаны лясоў мясцовага значэньня быў нейкі **Часлаўскі Станіслаў.** Меў ён буйную гаспадарку **23 дзесяціны зямлі, якую здаваў у арэнду сялянам-беднякам на кабальных умовах.**

Каб лепей замацаваць сваё становішча **Часлаўскі** наладжвае сувязь з старшынёй сельсавету **гр. Кармянком.** Але гэта для яго недастаткова. Прашло ня шмат часу, як **Часлаўскі** ўжо у братэрскіх адносінах з народным судзьдзёй Коханаўскага раёну **Страхалём.** Цяпер усё добра... Больш яму нічога ня трэба. Ён цяпер можа распараджацца ўсей вясковай гаспадаркай па свойму. Над лясамі **ён—гаспадар. Можна пушчаць сваю жывёлу на пасевы суседзяў, нават—эксплёатаваць батракоў колькі душы ўгодна...** Трэба адзначыць, што дзейнічаў не адзін **Часлаўскі Станісалаў,** а цэлая кампанія, яго брат **Янка** і др. кулакі.

Калі ў 1924-25 годзе лясьніцтва перадала ў карысьць сялян Сьвірані 40 пнёў будаўнічага лесу, **Часлаўскі Station** гэты лес перадае свайму брату **Янку** і апрача гэтага ён дазваляе яму дадаткова вазіць з гэтага лесу будаўнічы матар'ял, у выніку чаго **Часлаўскі Янка пабудаваў сабе вялізарны дом. А бедната нават і ня ведала, што яна на гэты лес зьяўляецца сапраўдным гаспадаром.** Адным словам, дзейнічалі яны ва ўсю. Баяцца некага. Хай у суд падаюць. Там-жа нас напэўне апраўдаюць...

Страхаль—свой чалавек... Так яно і было.

Падаўшаму ў Нарсуд скаргу на **Часлаўскіх, батраку Рышкевічу адмаўляюць у яго законным патрабаваньні.** Добра, што акруговы суд ухваліў перагледзець гэтую справу Нарсуду 9-га вучастку. Такія факты неадзіпны.

Акрамя гэтага бюрократы з сельсавету таксама свае людзі. **Часлаўскія зажылі сабе прыпяваючы...**

Папаўшы пад хірургічны нож РСІ, гэта хваробная балячка была ўскрыта з дапамогай Коханаўскага РК КП(б)Б.

Старшыня сельсавету **Кармянок** і судзьдзя **Страхаль** зьняты з працы..

Бюрократаў у вёсцы яшчэ шмат... Насельніцтва церпіць, але да вядомага часу. Аб гэтым даведаюцца. А даведаюцца па галоўцы не пагладзяць.

Р. Г-н,

Недагляд за вучнёўствам.

У выганной майстэрні працуе шмат моладзі, гэта моладзь у большасьці зьяўляецца ня зусім кваліфікаванай; здаецца было-б можна зрабіць, каб яна мела магчымасьць прывучыцца якой небудзь прафэсыі, але гэта ёй перашкаджаюць. Маладых хлапцоў робяць «майстрамі ад скуку на ўсе рукі». Сёньня хлапец працуе памочнікам слёсара, заўтра яго пераводзяць у бляхары, а там у маляры.

У выніку хлапец ня мае магчымасьці навучыцца чаму небудзь аднаму. Бязумоўна гэта ў моладзі адбівае цікавасьць да вытворчасьці.

Чаму не зрабіць так, каб той ці іншы хлапец працаваў у якасьці пам. слёсара ці бляхара?

Далей. Вучні школы вучнёўства, якія працуюць на прадпрыемстве ў якасьці практыкантаў (іх налічваецца 38 чал.) да гэтага часу атрымліваюць грошы па 4-му разраду (20 чалавек), а астатнія па 5-му, у той час калі школа ФЗУ павінна выпускаць рабочага ня менш як 6—7 разраду.

Тут паўстае пытаньне, чаму-ж яны не патрабуюць павялічэньня пэнсіі? А вось чаму.

Калі той ці іншы хлапец пойдзе трымаць пробу, дык яму дадуць зрабіць якуюнебудзь цяжкую рэч. А калі ён яе і зробіць, дык да яго прыдзіраюцца: то не вытрымаў паложаных часоў, то яшчэ якая хвароба знойдзецца, так і не павысяць. Маюцца гэтакія хлапцы, якія хадзілі на некалькі разоў трымаць, але правалiліся.

Другія ня ідуць.

Адміністрацыя кажа, што ў нашым прадпрыемстве рабочыя з вялікімі разрадамі ня вельмі патрэбны.

Гэтаксама прадстаўнік ад моладзі ў РКК ніколі не запрашаецца на пасяджэньні дзякуючы таму, што яму ня хочуць плаціць за той час калі ён не працаваў на прадпрыемстве.

Трэба, каб эконом праца была падняты, каб сапраўды моладзь адчувала, што яна працуе на соцыялістычным прадпрыемстве.

Мікола.

Чаго баяцца бюракраты.



Унутранае становішча СССР.

З дакладу старшыні Саўнаркому СССР А. І. Рыкава на 4-м Усесаюзным Зьезьдзе Саветаў.

2 мільярды 545 мільёнаў рублёў на народную гаспадарку.

Самае сутнае ў політыцы ўраду за справаздачныя два гады заключаецца ў тым, што плян індустрыялізацыі канчаткова ўстаноўлены, распрацаваны і ажыцьцяўлены на практыцы. На гэта трацяцца ўжо ня сотні тысяч, а мільёны рублёў. За гэтыя два гады прадукцыя ўсёй народнай гаспадаркі ўзрасла з 12 мільярдаў даваенных рублёў да 20 мільярдаў. 2 гады назад у прамысловасьці, транспарце і іншых галінах нашай народнай гаспадаркі было занята 9 проц. насельніцтва СССР, зараз гэтая колькасьць павялічылася да 11 проц.

У гэтым годзе ўрад рашыў укласьці ва ўсе галіны народнай гаспадаркі (прамысловасьць, транспарт, сельская-гаспадарка і г. д.) два мільярды 545 мільёнаў рублеў.

Ці можам вытрымаць цяжар капітальных страт.

У кожнага можа ўзьнікнуць пытаньне—ці можам мы вытрымаць у гэтым годзе цяжар такіх буйнейшых капітальных стратаў? Зараз яшчэ рана падводзіць вынікі, але ўсе адзнакі кажуць за тое, што гэты год пройдзе больш дабрабытней, чым мінулы. Праўда, гэтаму спрыяе і добры ўраджай і хлебазагатоўкі, якія ў гэтым годзе палепшыліся, і становішча грашова-валютнага рынку. Наш актыў па надворна-гандлёваму балянсу да моманту зьезду складаў каля 70 мільёнаў залатых рублёў. Гэтаму спрыяла, вядома, манаполія надворнага гандлю. За граніцай час ад часу пушчаюцца чуткі, што нашы адносіны да манаполіі надворнага гандлю мяняюцца. Я карыстаюся выпадкам, каб падкрэсьліць яшчэ, што манаполія надворнага гандлю зьяўляецца адным з устояў нашай экономічнай політыкі і ніякаму перагляду не падляжыць.

Стаўка на серадняцка-бедняцкія масы.

Пры праводзімым намі курсе на індустрыялізацыю краіны мы павінны ясна сабе ўявіць, на якія пласты вёскі ўрад павінен цяпер апірацца. Нашы адносіны да розных пластоў вёскі былі і застаюцца старымі.

Мы да гэтага часу трымалі і ў далейшым будзем трымаць стаўку на серадняцка-бедняцкія масы. Наша політыка супроць кулака павінна застацца непарушанай, але апіраючыся на серадняцка-бедняцкія масы, мы ня зьбіраемся ўвекавечыць катэгорыю бедняка. Паляпшаючы сельскую гаспадарку, мы гэтую катэгорыю зьнішчым і вывядзем яе на больш высокую гаспадарчую ступень.

Наша краіна будуе зараз соцыялізм. Індустрыялізацыя краіны зьяўляецца той праграмай, якая прывядзе нас да соцыялізму. Гэта праграма заключаецца ў тым, што ад лучыны мы павінны перайсьці да электрычнасьці, ад сахі—да трактару, ад цемры і няпісьменнасьці—да культуры і асьветы.

Як жыве і будуецца СССР.

Прэзыдыум прамысловага пляну ВСНГ СССР прыняў па дакладу Галоўэлектро пастанову аб пачатку ў бягучым будаўнічым сэзоне прац па пабудове 10-ці новых электростанцый.

Іванава-Вазьнясенская станцыя разьлічана на 90 тысяч кілёват. Каштоўнасьць першых прац вылічаецца ў 40 мільёнаў руб.

Чалябінская станцыя—на 65 тысяч кілёват. Каштоўнасьць усіх прац—35 мільёнаў руб. Будаўніцтва першай чаргі павінна быць закончана к 1931-32 г.

Бранская станцыя—магутнасьцю ў 45 тысяч квт. Каштоўнасьцю першых прац—17 мільёнаў руб.


Наварасійская—у 20 тысяч квт., агульнай каштоўнасьцю ў 7 мільёнаў руб.

Сьвірская станцыя разьлічана на 80 тысяч квт. Каштоўнасьць прац—75 мільёнаў руб. Канец пабудовы 1931-32 г.

Аршанская станцыя—магутнасьцю ў 22 тысячы квт., каштоўнасьцю 13 мільёнаў руб.

Краснодарская—на 22 тысячы квт.

Калагэранская, Гізэль-Данская і Рыонская разьлічаны на 21 тысяч квт.



Горкія ісьціны.

1. На тое і цыркуляр, каб яго ня чыталі.
2. Калі ў пратаколе экономнарады значыцца пытаньне аб спэцадзежы, разумей, што спэцадзежа даўно ўжо выдана і моладзь цікавіць зусім іншае пытаньне.
3. Хочаш прымусіць пачырванець дайка-чыка-прапануй яму зрабіць даклад на зразумелай мове.
4. Ня мудрона заяву ў колектыў падаць, а мудрона тры гады адказу чакаць.
5. У актывіста, што спрабуе працу „ўвязаць“—ніколі яна ня вяжацца.
6. Ты працу не паглыбляй, а ты яе зрабі.
7. Плян і планэта маюць нешта агульнае —і тое і другое лётаюць у паветры.

„Песьня аб флейце“.

Важна, у позе Напалеона рухаецца па вуліцы з вялізарнай папкай пад пахай, фінансавы агэнт 1-га раёну Менакрфа.

Грамадзянін Ітоль Ізраіль, рабочы па свайму соцыяльнаму становішчу, дык к таму-ж яшчэ дэмобілізаваны чырвонаармеец, быў у адзін з прыгожых дзянькоў патурбаваны прыходам фінагэнта «грозы наколічнага люду».

— Вы грамадзянін Ітоль?

— Так.

— Стаўлю ў вядомасьць, што з вас прычынаецца столькі-та рублёў прыбытковага падатку за 1926-27 год.

— ???

— Што вы асулпянелі? Адказвайце хутчэй, бо ня маю часу, будзеце плаціць?

— Выбачайце, таварыш! Якім чынам вы ад мяне патрабуеце падатак, калі я рабочы і яшчэ нядаўна дэмобілізаваўся з Чырвонай Арміі. Тут нейкая памылка. Пасудзіце самі.

— Гэта мяне не датычыцца! У выпадку адмовы ад плацежу я прымушан буду апісаць вашу маемасьць.

І ня гледзячы на протэсты Ітоля, дарэмна даводзячага, што ён не «вярблюд», за якога яго прымаюць, фінагэнт урачыста апісаў і забраў «маемасьць— злоснага неплацельшчыка», **флейту** (каштоўны музычны інструмант).

Толькі пасьля ўмяшальцельства бюро скаргаў НК РСІ, куды зьвярнуўся з заявай пацярпеўшы, Менакрфа агледзілася ў сваёй памылцы і патарапілася зьвярнуць грамадзяніну Ітолю забраную ў яго рэч.

Я. З.

Тыдзень пролетарскай дзетвары

Дзеці з Шанхаю, з Менску і з Лодзі— дружна згуртуйцесь у адным карагодзе

Рыхтуйцеся да Міжнароднага Дзіцячага Тыдню

(З адозвы Міжнароднага Дзіцячаго Бюро).

VII-мы міжнародны дзіцячы тыдзень хутка наступае.

У гэты тыдзень кожны з дзяцей працоўных павінен падумаць аб сваім жыцьці і аб жыцьці сваіх замежных братоў.

Апошні год прывёс новыя няшчасьці і пакуты для пролетарскіх дзяцей капіталістычных краін.

Пралятарскія дзеці Англіі атрымалі за гэты год вялізарныя страты ў час забастоўкі гарнякоў; дзеці Нямеччыны адчувалі надта цяжкія вынікі капіталістычнай рацыяналізацыі і беспрацоўя; дзеці Францыі, Чэха-Славакіі, Польшчы прымушаны ўжо з малых гадоў рыхтавацца быць салдатамі, каб абараняць дабро капіталістых.

Нечага і гаварыць аб цяжкім становішчы рабоча-сялянскіх дзяцей у фашысцкай Італіі, Баўгарыі, Венгрыі, Румыніі.

Але найбольш цяжкая доля выпала на долю кітайскіх дзяцей.

Толькі ў аднэй краіне сьвету—у пралятарскім Саюзу—становішча дзяцей працоўных паляпшаецца з кожным днём. Адчыняюцца новыя школы і больніцы, будуюцца пролетарскія дзіцячыя клюбы, організоўваюцца дзіцячыя пляцоўкі, ясьлі, разьвіваюцца вучэбныя майстэрні, кіно, тэатры, уцягваюцца ў працоўнае жыцьцё беспрытульныя дзеці. Бадзёрымі крокамі ідзе двухмільённая армія юных піонэраўленінцаў. Усьлед за гэтай арміяй ужо злучыліся дзіцячыя комуністычныя саюзы у 22 краінах сьвету.

Ва ўсіх краінах вы павінны, юныя таварышы, весьці прапаганду ў школах, на вуліцах, у сям'е, у дзіцячых організацыях супроць рабаўніцкай вайны і праводзіць кампанію дапамогі дзецям рэволюцыйнага Кітаю.

Усюды вы павінны высоўваць свае вымаганьні аб паляпшэньні вашага жыцьця, аб спыненьні прасьледваньняў у школах, аб барацьбе з фашысцкімі і буржуйскімі дзіцячымі організацыямі.

Выканком КІМ.
Міжнароднае Дзіцячае Бюро.



Як жывуць кітайскія дзеці.

На шоўка-прадзільнай фабрыцы.

Начная зьмена. Жанчыны і дзеці пасьпешна бягуць да сваіх станкоў. Прыблізна на кожных двух дарослых прыходзіцца адно дзіця. Дзеці ва ўзросьце ад 6—14 г. займаюць свае месцы над чанамі з кіпнямі. Яны ачышчаюць шоўкавыя коканы ад лупін і гатуюць шоўкаўвую нітку да пражы. Іх пальцы пастаянна касаюцца з кіпням і ад гэтага ўсе ў нарывах і балячках.

Дзеці працуюць стоячы і часта пераўтамляюцца да таго, што падаюць у обмарак.

«Колькі ты зарабляеш?»—запытаў васьмігадовую дзяўчынку сябра буржуазнай кантрольнай камісіі ў час абсьледваньня фабрыкі».

«Я працую 12 гадзін»—адказала яна—«і за гэта атрымоўваю 15—20 цэнтаў (кап.). Мне вельмі часта прыходзіцца працаваць ноччу. Я працую ўсю нядзелю без адпачынку».

Кругом чуцён плач дзяцей. Гэта грудныя маленькія дзеці сьпяць у вісячых карзінках. Маткам няма з кім пакінуць іх дома і яны прыносяць іх з сабою на працу: некаторыя дзеці прывязаны к сьпінам матак, другія поўзаюць у гразі і пылу сярод сьмецьця на падлозе каля машын.

Хутка яны дарастуць да 5—6 гадоў і тады такімі-ж стануць рабочымі каля варштатаў.

Большасьць дзяцей нічога не атрымоўваюць за сваю працу. Фабрыкант наймае дзяцей ў іх бацькоў і па дагавору плаціць ім па 2 рублі у месяц за адно дзіця, сам-жа зарабляе на іх 4 рублі. Атрымаўшы дзяцей па ўгавору, фабрыкант уладае імі як нявольнікамі. Дзеці жывуць у брудных, цёмных казармах, дзе іх вельмі кепска кормяць.

На сернікавай фабрыцы.

У Шанхаі, самым вялікім горадзе Кітаю, многа сернікавых фабрык. Выпрацоўка скрынак для сернікаў, упакоўка іх і другая дробная праца выконваецца дзецьмі.

Капіталістыя гавораць, што лоўкія ручкі дзяцей лепш усяго прыгодны да гэтае працы. Дзеці за сваю працу атрымоўваць па 3-5 капеек на дзень. На сернікавай фабрыцы паветра цяжкае і дрэннае для здароўя. Ад выпарваньня едкага белага фосфару, дзеці часта атручваюцца і хварэюць.

У кітайскай пральні.

Тут працуюць дзеці ад 13-15 гадоў. Яны мыюць, гладзяць, пераносяць вялікі груз і г. д. Маленькія дзеці дапамагаюць у зборы і разьмеркаваньні бялізны, яе пераносцы, высушваньні і прасаваньні. У пральні дзеці працуюць з усходу сонца да змроку і нават да позьняе ночы.

У рабочай больніцы.

У першым ложку ляжыць сямёхгадовы хлопчык, у якога бумага-прадзільня адарвала машынаю два пальцы. Ён працуе разам з сваімі двума маленькімі сястрычкамі. Утрох яны зарабляюць 11 капеек за дзень. Хлопчык, вядома, не атрымоўвае грашовае дапамогі.

Падыходзім да суседняга ложка. Там ляжыць 12-ці гадовая дзяўчынка, у якое машына адарвала частку рукі. Яе твар выяўляе надзвычайную ціхую радасьць. Мабыць яна першы раз у жыцьці спакойна спачывае.

Лёзунгі да VII-га Міжнароднага Дзіцячага Тыдню.

1. Дапамога дзецям паўстаўшага Кітаю—наш першы доўг.
2. Далоў драпежніцкую вайну супроць рэволюцыйнага Кітаю.
3. Не дапусьцім нападаў на першую рэспубліку працы—Савецкі Саюз.
4. У 7-мы Міжнародны Дзіцячы Тыдзень пролетарскім дзецям усягосьвету—братняе прывітаньне.
5. Міжнародны Дзіцячы Тыдзень—гэта тыдзень дзіцячай солідарнасьці і барацьбы.
6. Узмацнім сувязь з замежнымі піонэрамі і дапаможам ім.
7. Інтэрнацыянальная піонэрская капейка—ўзнос дзяцей у справу сусьветнай рэволюцыі.
8. Будзем гатовы пад сьцягам комсамолу быць непадзельнай моцнай сям'ёй.
9. Дапамагай Ленінскай партыі і комсамолу будаваць соцыялізм.
10. Вайна—нядбайнасьці і гультайству ў піонэрскіх шэрагах.
11. На павадыра спадзявайся, але і сам не плашай.
12. У піонэрскай ініцыятыве, самадзейнасьці—сіла піонэрскай організацыі.
13. На дапамогу бяспрытульным дзецям.
14. Узмацнім загад Ільліча--смычку гораду з вёскай.
15. Падрыхтуемся да працоўнага жыцьця, набудзем усе патрэбныя веды, будзем гатовы да абароны нашай краіны.

Замежны комсамол

... „Пацьвярджаю, што я комуніст і адмаўляюся ад вашай абароны“.

Пад прыгнётам румынскай ахранкі.

Пасьля крывавага падаўленьня татарбунарскага паўстаньня, у канцы 1924 году, эмісар Бухарэсцкага ўраду Татарэску хвалебна дакладваў:

— Бальшавіцкія ачагі ў Бэсарабіі зьнішчаны з коранем...

Сапраўды, партыйным бэсарабскім організацыям быў нанесены шэраг цяжкіх ўдараў. І сьцяг барацьбы цалкам перашоў у рукі Бэсарабскага Комсамолу.

Калі да 1925 году значны процант падсудных на політычных справах склалі комуністы, пасьля Татар-Бунар бэсарабскі тэрор жывіўся і жывіцца амаль выключна афярамі з шэрагаў Бэсарабскага Комсамолу (Груман, Кігель, Ліўшыц, Цялятнікава, Шапашнік, процэс Даўгача, процэс А. Фінкеля і шмат іншых).

У процэсе Даўгача з 6-ці абвінавачваемых было 5 комсамольцаў, па вайскова-політычнаму процэсу Гука больш паловы абвінавачваемых былі комсамольцы.

Калі на судзе румынскі адвакат, абараняючы комсамольца Грумана, ссылаўся на яго «зялёную моладасьць і несьвядомасьць», той устаў і сказаў:

— Я не прасіў вас весьці такую ахінэю. Пацьвярджаю, што я комуніст і адмаўляюся ад вашай абароны.

Неабходна ведаць умовы, у якіх жыве і працуе Бэсарабскі Комсамол, каб поўнасьцю ацаніць яго ролю і заслугі.

Пазбаўленыя сыстэматычнага вопытнага кіраўніцтва, пры нікчэмных матар'яльных сродках, а часта і зусім бяз іх, комсамольцы цяжкімі афярамі акупаюць усякую нявольную памылку, усякі організацыйны недахоп. Патрэбны, сапраўды гэроічныя патугі, каб умудрыцца ў басарабскіх абставінах і весьці адказную партыйную працу, клапаціцца аб політычнай самаадукацыі, дапамагаць арыштаваным таварышам, працаваць тайна ва ўмовах правакацыі, нечалавечага тэрору і рымынскага высьледжваньня.

Іх барацьба

Нядаўна адбыўся пленум ЦК Ангельскага Комсамолу. На пленум прыбылі прадстаўнікі ўсіх організацый — члены ЦК, за выключэньнем акругі Глазго.

Асноўнае пытаньне, якое стаяла на пленуме—гэта **барацьба супроць інтэрвэнцыі ў Кітаі і, у сувязі з гэтым, кампанія за адзіны фронт.**

Ангельскія войскі прадаўжаюць адбываць у Кітаі. У канцы красавіка з партоў Саўтгэмптон і Портсмут былі адпраўлены некалькі караблёў у Шанхай. З Саўтгэмптона выехалі 5.000 салдат і, акрамя таго, было адпраўлена 50 самалётаў.

Калі ў парту стала вядома аб адплыву войск у Шанхай, мясцовая комсамольская організацыя падняла кампанію ў доках. У 7 гадзін раніцы ў Саўтгэмптоне былі распаўсюджаны сярод рабочых-докераў 2.000 лістовак, якія заклікалі зьявіцца на дэмонстрацыю, у сувязі з адплыцьцем ангельскіх войск у Кітай.

Дэмонстрацыя прашла удачна.

У Саўптгэмптоне і Портсмуце арыштавана шмат комсамольцаў.

У кампаніі па барацьбе з інтэрвэнцыяй удзельнічаюць і некаторыя організацыі гільдый моладзі пры Незалежнай Рабочай Партыі.

Трэба сказаць, што аддзелы моладзі пры Незалежнай Рабочай Партыі за апошні час патрацілі значную частку сваіх сяброў, з тэй прычыны, што іх цэнтральныя органы выступілі супроць адзінага фронту з Комсамолам.

У Ланкашыры з 2.000 сяброў гільдый моладзі лік упаў да 1.000. У Бірмінгаме з 6 мясцовых аддзелаў засталося толькі 2. У Лівэрпуле, Файфшыры, Кондэнбідзе і Паўднёвым Уэльсе організацыі гільдый моладзі амаль зусім распаліся.

Трэба адзначыць, што ў Лівэрпуле гільдыі моладзі мелі адну з мацнейшых сваіх організацый.

Аднак, і тут організацыя гільдыі моладзі зусім распалася.

Пленум ЦК Ангельскага Комсамолу абгаварыў таксама пытаньне і аб дзіцячым комуністычным руху ў Ангельшчыне. Справа ў тым, што за апошні час у адносінах да саюзу «Юных таварышоў» урад узмацніў тэрор.

15-га мая адчыняецца другі зьезд саюзу «Юных таварышоў. Гэты зьезд знойдзе дастойны адказ на ўсе нападкі з боку ангельскіх капіталістых.

Удар па комсамолу Норвэгіі.

У горадзе **Осло** (Норвэгія) арыштован сябра Выканкому КІМ'у і сябра ЦК Норвэжскага Комсамолу тав. **Іоганн-Странд-Іогансэн.** У сувязі з гэтым нашаму маскоўскаму корэспондэнту паведамілі ў Выканкоме КІМ'у наступнае:

«Арышт застаў таварыша **Іогансэна** на пасту сакратара ЦК Норвэжскага Комсамолу.

Трэба думаць, што фармальным довадам к арышту паслужыў удзел тав. **Іогансэна** ў забастоўцы 1924 г. Побач з другімі, найбольш актыўнымі таварышамі, тав. **Іогансэн** быў ў гуртку, які кіраваў забастоўкай.

У барацьбе з забастоўшчыкамі, мясцовыя ворганы ўлады дапамагалі правакатарам, якім удалося выдаць некалькі актыўных кіраўнікоў забастоўкі. Дзейнасьць правакатараў была адкрыта і некалькі з іх былі зьбіты абуранымі рабочымі. Адзін з іх быў выкінуты з другога паверху.

Улада арыштавала тав. **Іогансэна**, якога лічылі галоўным кіраўніком забастоўкі. Ён прасядзеў у турме каля месяцу і потым быў адпушчаны да суду пад наглядам паліцыі.

У жніўні тав. **Іогансэн** быў абраны ў склад ЦК Норвэжскага Комсамолу, а на апошнім конгрэсе КІМ'у быў абраны ў Выканком КІМ'у.

У канцы 1924 г. тав. **Іогансэн** паехаў, з дазволу ЦК Норвэжскага Комсамолу, у Маскву, дзе працаваў у якасьці сябра Выканкому КІМ'у да красавіка мінулага году. У маі ён вярнуўся ў сваю краіну і быў абраны сакратаром ЦК.

Паліцэйскі ўрад, вядома, ведаў аб жыцьці ў горадзе Осло т. **Іогансэна**, які знаходзіўся пад судом. Калі да гэтага часу тав. **Іогансэна** не арыштоўвалі, дык толькі таму, што паліцыя імкнулася нанесьці ўдар комсамолу ў самы выгадны для сябе момант.

«Такі момант настаў цяпер. Краіна стаіць перад буйным гаспадарчым і політычным хістаньнем. У бліжэйшыя дні павінен пачацца прызыў моладзі на вайсковую службу. А тав. **Странд-Іогансэн** вядомы сваёй энэргіяй у барацьбе супроць мілітарызму.

Арыштаваўшы тав. **Іогансэна**, норвэжскі ўрад спадзяецца расчысьціць сабе шлях для далейшага наступленьня на рабочую моладзь Норвэгіі».

ТАМ, ДЗЕ ГОРА І ЗЬДЗЕКІ.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ—ДЗЕЦІ ПАКУТУЮЦЬ.

У савецкай краіне дзеці рабочых і сялян маюць свае організацыі, піонэрскія атрады. У школах аб'ядноюцца ў розныя гурткі, свабодна абмяркоўваюцца розныя пытаньні, тут дзеці—новыя будаўнікі.

Недалёка ад нас—у Заходняй Беларусі (пад панскай Польшчай)—над маладым пакаленьнем—дзецьмі учыняюцца зьдзекі. Там над галавамі дзяцей вісіць панскі бізун, там настаўнік—кат, там чуюцца енкі дзяцей.

Дзеці ня маюць магчымасьці вучыцца ў сваіх родных школах,—школы пазачыняны. У Заходняй Беларусі ўжо зачынены 382 беларускія школы; 18 школ перароблены ў польска-беларускія, каб потым апалячыць і гэтыя. Зараз на 27 паветаў маецца ўсяго 4 беларускія пачатковыя школы. Сялянства падало 412 заяў на адчыненьне беларускіх школ, і ўсе гэтыя заявы былі пустым гукам для ўлады. Урадам адчыняюцца польскія школы, пад прымусам нагаек адчыненыя сялянствам беларускія прыватныя школы зачыняюцца ўрадам.

Сяляне ня пускаюць дзяцей у польскія школы—за гэта іх штрафуюць. «Няхай лепш бадаецца дзіця невукам, а там далучымся да Савецкай Беларусі—цыж нагонюць»—кажуць сяляне. Дзеці самі выносяць протэсты, каб выкладаньне было на беларускай, а не на польскай мове. У аднэй польскай школе было такое здарэньне: настаўнік сказаў вучням «наютро жэбы кажды мял жёшыт» і паказаў у руцэ сшытак. Вучань зразумеў, што сшытак трэба абшыць ніткамі. Назаўтра на пытаньне настаўніка, ці ўсе маюць сшыткі? той вучань адказаў: «я зрабіў», і паказаў яму абшыты ніткамі сшытак. Вось прыклад, як разумеюць беларускія дзеці польскую мову.

Настаўнікі беларусы з Заходняй Беларусі высяляюцца, а замест іх даюцца настаўнікі-палякі. Гэтыя настаўнікі ня вучаць, а мучаць дзяцей; замест вучобы прымушаюць працаваць дзяцей на карысьць настаўніка. **«Дзеці прыходзяць у школу, а настаўнік сьпіць! Тады ён устане і загадае дзяўчатам-вучаніцам скрэбці бульбу, а хлопцам-вучням—курку скубці. А як навараць есьці вучыцелю і ён наесца—пачынае тады «вучыць». Загадвае дзецям сьпісаць яму праваслаўную малітву, а сам некуды йдзе; дзеці-ж на «лекцыі» адны! А то бывае выгане дзяцей на мароз, а сам зачыніўшыся ў клясе, «гасьцей прымае»... вучыцель прымушае дзяцей, каб прыносілі яму мяса, яйкі, каўбасы і іншыя рэчы»**—так пішуць самі сяляне аб жыцьці школ у Заходняй Беларусі і аб іх настаўніках. Пануюць у школах і «мардабойствы», ад чаго дзеці кідаюць школы. Настаўнікі ўхітраюцца браць і за гэта магарычы з сялян, бо па яго даносу іх могуць аштрафаваць, што ня пускаюць дзяцей у школу.

Польская школа мала прыносіць карысьці для дзяцей-беларусаў; школа не бярэ на сябе абавязка організаваць пазашкольнае жыцьцё вучняў. Таксама і ў сьценах школы вучні ня могуць організаваць свой вольны час, пачытаць кніжку, газэту, пагуляць. Навука іх ня цікавіць, бо яна даецца ім у чужой і незразумелай мове. Сядзіць, сядзіць іншае дзіця за лемантаром гады 3-4, а прыдзецца дык і літараў ня знае.

У Заходняй Беларусі для сялян, рабочых і дзяцей ня толькі не даступныя школы, там разганяюцца розныя організацыі, саджаюцца за політычную дзейнасьць лепшыя рабочыя і сяляне. Там у турмах пакутуе 6 ½ паловай тысяч чалавек рабочых і сялян, і ў гэтым ліку не малы процант і моладзі.

Там, у Польшчы, рабочая моладзь жыве ў нязвычайна дрэнных умовах.

Ад непамернай працы моладзь хварэе: там на кожных 7 чалавек маладых рабочых—1 хворы сухотамі. І гэта ня дзіва, калі прымушаюць працаваць у дзень па 12-14 гадзін...

Зробім усё магчымае, каб дапамагчы дзецям рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы!

Адась Ветка.

Газэта у вёсцы.

Як скарыстоўваем газэту.

(Капыль, Случчына).

Наша Капыльская белсямігодка выпісвае шмат рознастойных газэт і часопісяй.

Усе гэтыя газэты школа скарыстоўвае наступным чынам: пры сямігодцы вучком арганізаваў вучнёўскі клюб, дзе тры разы ў тыдзень праводзіцца чытка газэт, а таксама гульня ў шашкі і шахматы.

Апрача чыткі ў школе вучком організаваў таксама чыткі **па раёнах Капыля**, куды вылучыў сваіх таварышоў-вучняў **дзеля правядзеньня чыткі сялянам.**

Чытка праводзіцца па раёнах таксама тры разы ў тыдзень, у тыя вечары, калі не бывае чыткі ў школе.

Сяляне гэтаю справаю вельмі цікавяцца і з падзякаю чытаюць газэты. Галоўным чынам цікавяцца міжнародным становішчам, а таксама сельска-гаспадарчым аддзелам. Усё добра, толькі адзін недахоп у гэтай справе, што некаторыя газэты затрымліваюцца загадчыкам школы **Фамою Сілычам** і не сваечасова трапляюць на раён.

Усё-ж такі сяляне газэты чытаюць і шчыра дзякуюць школе за добры пачын.

Ц. Ракіта.

Лес--багацьце і краса Беларусі

Шануй лес сам—навучай гэтаму другога.

Лясная гаспадарка ў лясох.

Сялянам неабходна ведаць наступныя асаблівасьці гаспадаркі:

1) Хваёвы лес (сасну і елку) можна сячы ў 80 гадоў, бо ў гэтым узросьце выходзіць найбольш ляснога матар'ялу, які патрабен сялянству. (Паасобныя дрэвы дасягаюць таўшчыні ад 3-х да 9-ці вяршкоў).

2) Лісьцявы лес (бяроза, вольха і інш.) сякуць у 50-60 гадоў.

3) Сячы лес трэба на лесасеках вузкімі палоскамі ці паасобнымі дрэвамі.

4) Шырыня лесасекаў у хваёвым лесе павінна быць ад 20 да 30 саж.: яна дае магчымасьць абсеменьненьня ад сьцяны некранутага лесу; у лісьцявым лесе шырыня лесасекі можа быць 50-60 саж., бо насеньне лісьцявых парод лягчэй і далей разносіцца ветрам.

5) Лесасека заўсёды павінна праходзіць упоперак кірунку ветра. Часьцей гэта бывае з поўначы на поўдзень.

6) Для лепшага лесааднаўленьня лесасекаў у хваёвым лесе пакідаецца да 30 штук насеньнікаў.

7) На тых лясных вырубах, дзе лес не аднаўляецца, трэба зрабіць пасеў ці пасадку лесу пад кіраўніцтвам ляснога спэцыялістага.

8) Прыроднага аднаўленьня лесу на вырубках трэба чакаць ад 3 да 5 гадоў, бо сямяньнікі прыносяць насеньня ня кожны год, а праз 2-3.

9) Як толькі аднавілася лесасека, то прылягаючая сьцяна лесу можа быць таксама высечана.

10) Задзервянелую вырубку можна нават араць у працягу 2-3 гадоў для лепшага аднаўленьня лесу.

11) Пасьвіць жывёлу на лесасеках, у маладнякох ні ў якім разе нельга.

12) Калі лес аднаўляецца ў працягу 80 гадоў, то пасьля гэтага часу можна ўжо высякаць па 1/80 частцы лесу.



Прысады грэблі.

(Вёска Сінягова, Старадарожскі раён, Слуцкая акруга).

27-га красавіка ўсе комсамольцы нашай вёскі сумесна з беспартыйнай моладзьдзю і аб'ешчыкам тав. **Шэшко** пашлі ў лес, накапалі там маладзенькіх дрэўцаў і потым правялі пасадку на грэблі. Таксама пасаджана многа дрэўцаў на вуліцы каля хат сялян.

Пасьля пасадкі ўсе сабраліся ў школу, дзе была праведзена гутарка

Ліўшыц Р.

Сьвята ў лесе.

... 8-га мая. Нядзеля.

Раніца. Цёплы сонечны дзень. Першы дзень па сваёй прыгожасьці ў гэту весну..,

Каля хаты-чытальні—моладзь з рыдлёўкамі

Сьмех... Песьні... Жарты.

Прышлі піонэры і школьнікі. Яшчэ больш ажыў пляц, што клінам упёрся ў будынак хаты-чытальні.

Цёплая паветра з лагодным вецярком, запоўненая сьпевам, прасnуўшыхся пасьля зімы і выгаладаўшыхся ў халодныя дні вясны, пчолак і машкары, перарэзалася папалам гарэзьлівымі гукамі гармоніку.

Па вуліцы ішоў гарманісты комсамолец Міхась, спрытна дакранаўся пальцамі клавішаў, то расьцягваў то сьціскаў мех, а кучка моладзі, што ішла побач з Міхасём, бадзера падпявала:

--- Лес кудравіць, лес гамоніць.
Ад пажару лес завеса.
Запішуся я сягоньня
Ды ў «прыяцелі лесу».

Узяўшы сьцягі, стройнымі шэрагамі накіравалася моладзь у лес. Па дарозе далучаліся малыя дзеці і сівенькія дзядкі.

* * *

Уваходзілі ў лес---сэрца разрывалася ад радасьці. Дзяўчаткі прагна заглядалі ў вочкі расквітнеўшых «падсьнежнікаў», кожнай хацелася белкай скокнуць у бок, сашчыпнуць красачку і прыкалоць сабе да кофтачкі.

Чыстая паветра з пахам сасновай смалы старанна ўцягвалася ныркамі, разшырала грудзі, што выклікала прыемнае адчуваньне.

Кожны быў ахоплен жаданьнем ---жыць у лесе, дыхаць паветрай прафільтраванай дрэвамі, слухаць нясьціханную музыку насельнікаў лесу.

Узяліся за працу. Капалі маладзенькія дрэўцы, беражліва даставалі іх з зямлі, баючыся прынесьці боль карэньчыкам. Кіраваў працаю аб'ешчык.

Потым узяўшы, ахапак выкапаныя дрэўцы, моладзь накіравалася на толькі што адбудаваны шлях. Пасадзілі прысады. Засталося некалькі дрэўцаў. Дзе іх пасадзіць?

— Давайце абсадзім хату Івану. Ён калека і сам гэта зрабіць ня можа!—прапанаваў дзядзька Сымон.

— Даёш!

Бедняк Іван, якому белапалякі за партызанства адсеклі руку, умілена глядзеў на жыцьцёрадасную моладзь, што садзіла у сьвежыя ямачкі маладыя клянкі і ліпкі і ня ведаў, як выказаць сваю гарачую падзяку.

Зьм. Гарошын

Хата-чытальня і Райвыканком—у маладзенькіх дрэўцах.

(Чырвона-Слабодзкая ячэйка ЛКСМБ, Слуцкая акруга).

Да дню лесу ячэйка праводзіла вялікую падрыхтоўчую працу. У вызначаны дзень комсамольцы з лясьніком пашлі ў лес накапалі маладзенькіх дрэўцаў і абсадзілі памяшканьне хаты-чытальні і Райвыканкому.

У пасадцы шчыры ўдзел прымалі комсамольцы і піонэры.

Міхалкоў.

Барысаўцы падрыхтаваліся.

(Завод «Комінтэрн», Нова-Барысаў).

Нас едзе на экскурсыю 13 чалавек. Большасьць экскурсантаў--гэта рабочая моладзь завода Комінтэрн. Падрыхтоўка пачалася за месяц да дню выезду. З вялікім захапленьнем у часы перапынку хлопцы вялі размовы аб нябачаным вялікім савецкім індустрыяльным горадзе Ленінградзе, аб найвялікшай магутнай электрастанцыі Волхаўбудзе. Спрачаліся, крычалі. Прапаноў было вельмі многа. Усе хацелі ехаць. Хутка згаварыліся. Была паслана дэлегацыя ў заводаўпраўленьне «Комінтэрн» з прозьбаю аб выдачы належных сродкаў і аб вызваленьні ад працы ў час паездкі.

Нам не адмовілі. Заводаўпраўленьне пашло на сустрач і належныя сродкі і водпуск былі дадзены.

Вось саюз дык у гэтым сэнсе падкачаў. Ня гледзячы на шматлікія заявы і просьбы, саюзам нічога ні было зроблена. Адмовіліся дапамагчы экскурсантам.

Але-ж хлапцы ня палі духам. Самі сваімі сіламі наладзілі вечар. Вечар прайшоў жвава. Сродкі здабылі. Заўтра ўсе жадаючыя выяжджаюць знаёміцца з чырвонаю краінаю, з нашым вялікім будаўніцтвам. Настрой ва ўсіх вельмі добры. Прад вачыма ў марах пакуль-што Ленінград-Кранштат-Волхаўбуд.

фама Таўгэр.

Ворагі лесу і барацьба з імі.

Моладзь, гадуй сабе лес!

Лес павінен быць крыніцаю пастаяннага здавальненьня драўнінаю нашых патрэб ня толькі ў сучасны момант, але і цэлага шэрагу будаўнічых пакаленьняў. Старыя людзі ў вёсцы гавораць: «Эх, былі ня надта даўно тут каля сяла вялікія лясы, а вось цяпер, куды яны падзеліся, і самі ня ведаем»!. Але ёсьць і такія вёскі, якія і за 50 вёрст, ня могуць атрымаць лесу на будоўлю, таму што лесу мала.

Адсюль вынікае патрэбнасьць самых беражлівых адносін з боку сельскага насельніцтва да лесу. Кожны ведае, што сасну сьпілаваць можна за 5 мінут, а каб яна вырасла, то трэба ня менш, як 80 гадоў.

Вясковыя дзеці і падрастаючая моладзь павінны памятаць, што калі іх бацькі будуць самавольна драпежна сячы лес, то яны застануцца ў будучыне бяз лесу. Можна скажаць, што галоўнейшыя ворагі лесу у наш час, гэта самавольныя парубшчыкі. Калі тры гады таму назад можна было мірыцца з самавольнымі парубкамі, то цяпер гэтага рабіць нельга. Становіцца праступным ня толькі раскрадаць, але і дапушчаць раскраданьне.

Якія-ж меры могуць быць ужыты ў барацьбе з самавольнымі парубкамі?

1) Правільная організацыя аховы лесу.

2) Выхаваньне сярод насельніцтва сьвядомасьці і беражлівых адносін да лесу.

3) Удзел у ахове лесу ўсіх сьвядомых грамадзян рэспублікі.

4) Перавыхаваньне грамадзкае думкі вёскі і асабліва моладзі, будучых актыўных удзельнікаў у політычным і гаспадарчым жыцьці старонкі.

Лесу ў нас засталося цяпер мала і карыстацца ім трэба разумна. Самавольная парубка лесу ёсьць згуба, бо дрэвы бяруцца ня там, дзе іх мог-бы ўзяць лясьнічы. Самавольшчык сячэ і вывозіць ноччу, насьпех і таму наносіць вялікую шкоду маладняку, самасеву і суседнім дрэвам.

Апрача таго, трэба заўважыць, што некаторыя дрэвы прызвычаіліся жыць у цяньку і гэткая раптоўная парубка можа дрэнна адбыцца на жыцьці маладога дрэўца-цянялюба.

Згубна адбіваюцца на лясной гаспадарцы і лясныя пажары, вецер, пасьба жывёлы і шкоднікі лесу, як расьлінныя паразіты і кузуркі.

Ад лясных пажараў у час вайны і рэволюцыі, а таксама самавольшчыны і няпланавай рубкі шмат зьнішчана лесу. З гэтай прычыны цяпер наглядаецца абмяленьне рэк, пашырэньне плошчаў сыпучых пяскоў, засуха—усё гэта наносіць **цяжкі ўрон і сялянскай гаспадарцы.**

Прычынай пажараў звычайна бывае неасьцярожнасьць з агнём. Бездаглядная цеганіна жывёлы па лясох вельмі шкодзіць ім, бо яна дратуе драўесныя ўсходы, скусвае маладыя ўсходы і падросткі і ўтаптвае глебу.

Жывёлу трэба пасьвіць умела пад наглядам дарослага пастуха і не па ўсім лесе, а толькі там, дзе дазволіць лясьнічы.

Хоць лесу і шмат што шкодзіць, але калі ўсе сяляне пачнуць аднаўляць лясныя гаспадаркі, берагчы лес, памятаючы, што збожжа можна сеяць і жаць кожны год, а лес на адным і тым самым месцы можна сячы толькі праз кожныя 100 год, то правільнай лясной гаспадаркай мы зможам узбагаціць нашу дзяржаву.

Таксатар **Лімантаў.**



ПРЫЗЫЎ перамеНЬнікаў

Узмацнім працу па сатаварыству грамадзянскіх ячэек комсамолу з вайсковымі комсамольскімі групамі.

Прахаджэньні вайсковай службы

ў пераменым складзе тэрыторыяльных частак

Народны Камісар па Вайсковым і Марскім Справам **тав. Варашылаў** зацьвердзіў настаўленьне, у якім вызначаецца парадак прахаджэньня сталай вайсковай службы ў пераменным складзе тэрыторыяльнага войска.

Згодна зацьверджанага парадку прахаджэньня службы, знаходжэньне на службе ў шэрагах РСЧА для ваенна-служачых пераменнага складу вызначаецца прабываньнем яго **на трохмесячным навучаньні на першым гаду службы і вучэбных збораў.** У наступныя гады, у часе знаходжэньня ў водпуску, ваенна-служачыя пераменнага складу маюць права, па свайму погляду, выбіраць род заняткаў, службы ці працы, зьяўляючыся сябрамі профсаюзу, выбіраць па свайму погляду месца сталага жыцьця і маюць права вольнага пераезду па ўсёй тэрыторыі Саюзу на агульных падставах з усімі грамадзянамі, з захаваньнем правіл вучоту.

Такім чынам, сталая ваенная служба ў пераменным складзе тэрыторыяльных частак абавязвае ваенна-служачага выконваць прамыя абавязкі па службе толькі ў тэрміны знаходжэньня ў складзе вайсковых частак. Гэтыя тэрміны, як вядома, законам ўстаноўлены на першым гаду службы—**3 месяцы і ў наступныя 4 гады—ад 2 да 1 месяцу.**

Па зацьверджанаму настаўленьню папярэдніх дазволаў для перамены месца знаходжэньня пераменнага складу не ўстанаўліваецца, а, замест гэтага, пры часовых выездах на заработкі, устанаўліваюцца толькі правілы захаваньня вучоту, і толькі, у выпадку пераезду на сталае жыхарства, устанаўліваецца папярэдняе паведамленьне аб гэтым камандзіра часткі.

Часовы выезд з пункту сталага жыхарства, у часе водпуску, у межах тэрыторыі комплектаваньня сваёй часткі ці павета, робіцца без выкананьня якіх-бы то ня было абавязкаў нават па вучоту, і толькі, у выпадку выезду за межы комплектаваньня сваёй часткі ці акругі на тэрмін звыш аднаго месяцу, **пераменны склад абавязан паведаміць аб сваім выезьдзе камандзіру часткі праз сельсавет ці бліжэйшы ваенна-вучотны ворган.**

Больш строгія правілы устанаўліваюцца перад пачаткам вучэбных збораў. За месяц да пачатку вучэбных збораў, калі аб гэтым было апавяшчэньне, пераменны склад ва ўсіх выпадках выезду з пункту сталага жыхарства, як у межах акругі, так і за межы, на тэрмін звыш трох дзён—**абавязан паведаміць аб гэтым камандзіру часткі праз сельсавет ці бліжэйшы ваенна-вучотны ворган.**

Для перамены сталага мёсца знаходжаньня, **у выпадку перасяленьня на новае месца**, пры зьмене роду заняткаў ці пераводу па службе, **пераменьнік павінен падаць загадзя заяву праз сельсавет ці бліжэйшы ваенна-вучотны ворган для атрыманьня неабходных дакумантаў, зьвязаных з пераездам.** У гэтым выпадку, таксама, пры падачы заявы, за месяц да пачатку вучэбных збораў, пераменны склад абавязан у сваёй частцы адбыць вучэбны збор.

Настаўленьне пералічвае прычыны, якія лічацца паважнымі пры неяўцы на зборы і парадак выключэньня з пераменнага складу.

Такім чынам, для пераменнага складу у часе водпуску даецца значная палёгка.

Чырвонаармейцы - пераменьнікі з свайго боку павінны ўзмацніць увагу да задач умацаваньня тэрыторыяльных частак.

Замацуем сатаварыства

З надыходам летніх тэрыторыяльных збораў, комсамольскім організацыям вайсковым і грамадзянскім трэба вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы па сатаварыскай працы. Сатаварыская праца павінна быць наступнай.

Сатаварыскія ячэйкі да пачатку збору распрацоўваюць плян працы, прыкладна, на збор навабранцаў, і з таго і другога боку вылучаюць комсамольцаў, на якіх ускладаецца абавязак увязкі працы сатаварыскіх ячэек па выпрацаванаму пляну. Вылучэньне спэцыяльных асоб дае магчымасьць не загружаць гэтай працай сакратароў ячэек і больш цьвёрда праводзіць вызначаную працу.

Грамадзянскія комсамольскія організацыі павінны аказаць сутную дапамогу вайсковым групам па ахопу комсамольскім уплывам прыбываючага маладняка. Пытаньні ільгот, сельгаспадатку, некаторыя нездавальненьні на мясцовыя нізавыя ворганы ў вёсцы і г. д., бяссумненна, будуць мець месца ў першыя дні прабываньня маладняка ў тэрчасьці. Праз вечары пытаньняў і адказаў, масавыя гутаркі, насьценную газэту на асобных хвалючых пытаньнях, грамадзянская ячэйка, асабліва савецка-адміністрацыйная, павінна быць выкарыстана ў поўнай меры.

У сатаварыскую працу вайсковым комсамольскім групам, комсамольскім ячэйкам прадпрыемстваў і устаноў трэба ўцягнуць і беспартыйную масу моладзі. Асабліва важна і неабходна сувязь з вытворчымі прадпрыемствамі. Формы сувязі могуць быць рознастайнымі. Сумесныя экскурсыі ў сьвяточныя дні ў поле і лес чырвонаармейцаў з рабочай ці служачай моладзьдзю. Экскурсія па азнаямленьню з бытам, вытворчасьцю і працай установы. Організацыя вечароў досугу--маёўкі ў сьвяточныя дні з праграмай ад вуснай газэты, дэклёмацыі да хору і гармоніку.

Нарэшце, апошняе аб вайсковай працы ў грамадзянскіх організацыях. У летні пэрыод вайсковыя куткі і гурткі павінны не паслабляць сваёй працы, а наадварот, прыстасавацца да летніх умоў і паглыбіць яе.

Асноўны кірунак у наладжваньні працы гэтых організацый павінен ісьці, відома, праз адпаведныя ворганы: клюбы, ячэйкі ТСА Авіяхіму, а комсамольцы вайсковых груп павінны падштурхоўваць працу, аказваць дапамогу і падтрыманьне грамадзянскім організацыям.

П. Іл.

Вайсковая консультацыя адказвае.

1. Для паступленьня ў аб'яднаную ваенную беларускую школу імя ЦВК БССР па расійскай мове неабходна ведаць: пісаць бяз грубых граматычных памылак і ўмець правільна будаваць простыя сказы. Паступаючы павінен умець граматна і лёгічна выкласьці пісьмова матар'ял, які яму вядомы, г. зн. тое, што ён бачыў, перажыў ці што яму прачытана. Неабходна знаёмства з творамі сучасных пісьменьнікаў, як напрыклад: Сейфуліна, Няпераў, Малышнік, Дзямян Бедны, Усев. Іваноў і інш.

2) Па матэматыцы трэба ведаць:

а) Паступаючым на пяхотнае аддзяленьне: сталыя веды 4-х арытмэтычных дзеяньняў з цэлымі лікамі. Мэтрычныя меры. Знаёмства з самымі простымі дробамі.

б) Паступаючым на артылерыйскае аддзяленьне ўвесь курс арытмэтыкі.

3. Па географіі неабходна праправацаваць: а) Іваноў.—1-2-3 часткі, б) Рудняў і Ускоў.—«Учебнік всеобщей географии» в) Карты, глобус.

Мець элемэнтарныя веды аб клімаце зямлі, яго залежнасьці ад розных умоў, аб расьціцельных зонах, ліку і плотнасьці насельніцтва зямлі, расах і г. д.

Ведаць географію галоўных капіталістычных дзяржаў, і дзяржаў, якія мяжуюцца тэрыторыяльна з СССР, і элемэнтарна гэографію СССР (умець іх знаходзіць на карце, паказаць галоўныя гарады, гаспадарчыя раёны і г. д.)

4. Па пастанаўленьню НКА БССР скончыўшыя АБВШ лічацца атрымаўшымі асьвету за сямігодку, калі яны скончылі па пяхотнаму аддзяленьню і за тэхнікум, калі яны скончылі па артылерыйскаму аддзяленьню.

Наша слова аб Дзяржтэатры:

паменш шаблёну—пабольш жыцьцёвай праўды! бліжэй да сучаснасьці, да нашых дзён!

На тэатральным дыспуце моладзі, наладжаным „Чырвонай Зьменай“ і клюбам імя КІМ

Менская рабочая моладзь з нецярплівасьцю чакала таго дню, калі можна будзе сказаць свае слова аб тэатры, абмяняцца думкамі аб ільготных пастаноўках у БДТ якія былі наладжаны рэдакцыяй газэты „Чырвоная Зьмена“ і клюбам „КІМ“.

Білеты на дыспут распаўсюджваліся вельмі хутка, кожны хацеў папасьці ў гэты дзень у тэатр...

І гэты доўгачаканы дзень нарэшце настувіў,—у залі прысутнічае звыш 600 асоб.

* * *

Адчыняючы дыспут ад імя рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ і праўленьня клюбу імя „КІМ“ тав. **Курцік** спыніўся на асноўных мэтах дыспуту:

— **Выявіць ці апраўдалі сябе спэктаклі, арганізаваныя ў тэатры рэдакцыяй сумесна з праўленьнем клюбу „КІМ“, што яны далі моладзі і, нарэшце, выявіць тэатральныя запатрабаваньні маладога гледача.**



Выступае ў спрэчках друкарка. Наверсе ў авале артыстыя БДТ за кулісамі прыслухоўваюцца да спрэчак.

Пасьля выбару прэзыдыуму, у які ўвашлі таварышы Абрамчук, Ігнатоўскі Баліцкі, Бараньнікаў, Ратнэр, Шаліма, Табайнік, тэатральныя працаўнікі т. т. Міровіч, Дыла і інш., з уступнай прамовай **на тэму „Тэатр і моладзь“ выступіў**

тав. Ігнатоўскі.

Дакладчык пачаў сваю прамову з прывітаньня Менскай рабочай моладзі—новаму тэатральнаму гледачу—ад імя Інстытуту Беларускай Культуры:

— **Газэта „Чырвоная Зьмена“, комсамольская організацыя ўпяршыню організавалі такі шырокі пролетарскі суд на тэатрам. Гэта факт буйнага культурна-політычнага значэньня.**

— На нашых вачох адбываецца зьявішча якога нельга недаацаніць,—**расьце, выяўляецца і заяўляе аб сваіх запатрабаваньнях новы тып тэатральнага гледача--рабочая моладзь.**

— Што ёсьць сучасны тэатр?

— Комуністычная партыя і ў прыватнасьці Уладзімер Ільліч Ленін неаднакраць падкрэсьлівалі, што нам трэба аўладаць усёй культурай, якую пакінула пролетарыяту буржуазія. Бяз гэтай створанай стагодзьдзямі культуры нельга пабудаваць комуністычнай грамады.

Пролетарская культура скарыстоўвае ўсе веды, якія набыла чалавецтва за ўвесь час мінулага панаваньня буржуазіі і адначасова наўна новым, рэволюцыйным зьместам.

— Наша задача—**дабіцца, каб уся гэтая культура, аднэй з галін якой зьяўляецца тэатр, стала здабыткам самых шырокіх мас працоўных.**

—**Як-жа практычна наблізіць пролетарскую культуру да самых шырокіх масаў працоўных?** Патрэбна прыпадносіць яе масам у самым популярным і зразумелым ім выглядзе. Адсюль і лёзунг партыі—**Культура пролетарская па зьместу і нацыянальная па форме,** бо масы здольны ўспрымаць навуку, мастацтва і ўсю культуру наогул толькі на роднай мове, у блізкім і даступным яе разуменьню выглядзе.

— Пролетарская культура і, у прыватнасьці, тэатр павінны падлягаць крытыцы, ацэнцы мас. **Наш сёньняшні дыспут і зьяўляецца масавай пролетарскай крытыкай аднэй з галін пролеткультуры.**

— **Тэатр, які адбівае і асьвятляе ўсе праявы чалавечага жыцьця сучаснага і мінулага, можа і павінен стаць даступным і зразумелым усім без выключэньня масам, нават і няпісьменным!** Вось пад якім кутом погляду і павінна працякаць наша крытыка тэатру, сёньняшні дыспут.

Пасьля ўступнай прамовы тав. **Ігнатоўскага** пачаліся спрэчкі.

Перажывалі моманты клясавай барацьбы...

Мунвіс (настаўнік). Ці здаволілі пастаноўкі БДТ моладзь, якая на іх прысутнічала? Так, у агульным задаволілі.

Калі-ж запытацца—ці былі ўсе гэтыя пастаноўкі цалкам прыстасаваны да запатрабаваньняў нашай моладзі, я павінен адзначыць, што ня зусім. Напрыклад, нам паказалі **„Стралок Тэль“**, якая разьлічана на выключна на дзяцей, але нікольні не адпавядае думкам і настроям гледачоў крыху старэйшага ўзросту. У працівагу „Тэлю“ пастаноўка **„Над Нёмнам“** спадабалася маладому гледачу, прымусіла яго самога перажываць моманты клясавай барацьбы на крэсах, рэволюцыянізавала моладзь і наогул адыграла значную выхаваўчую ролю...

Пару слоў аб білетах. Параўнаўча ня высокія па цане, яны, аднак, былі недаступны некаторым пластом моладзі. Гэты недахоп трэба зьнішчыць.

Бліжэй да жыцьця!

Давідовіч (школа друкароў). Моладзі якая прысутнічала на пастаноўках, спадабаліся ў першую чаргу п'есы, адбіваючыя сучаснасьць („Над Нёмнам“ і г. д.). Вось чаму мы і кажам тэатру: пабольш пастановак, якія малююць нашу сучасную эпоху, паменш п'ес з старадаўняга мінулага!

Удзешавіць білеты.

Серабранскі (мэталісты). Некаторыя п'есы з паказаных моладзі былі ёй незразумелыя, як, напрыклад, **„Вір“**. Асаблівай вартасьці гэта п'еса ня мае, толькі і добрага ў ёй, што музыка і дэкорацыя.

У п'есе **„Над Нёмнам“** нам падабаюцца толькі два апошнія акты, першыя-ж два вызначаюцца сваім няглыбокім зьместам і нічога моладзі ня далі. **Лічу, што ільготныя спэктаклі для моладзі трэба наладжваць часьцей, прыкладна,** раз у тыдзень.

Вельмі добра, што дзякуючы ініцыятыве „Чырвонай Зьмены“ мы мелі магчымасьць некалькі раз наведаць тэатр і пазнаёміцца з лепшымі пастаноўкамі сэзону. Але памятайце, што значная частка моладзі—матар'яльна незабясьпечаныя пласты, беспрацоўныя і г. д.—не змагла трапіць у тэатр, бо цэны на білеты для іх сьціплага бюджэту былі высокія...

Тэатр дасягае сваёй мэты.

Ільлінскі (артысты БДТ). Наш тэатр імкнецца даць свайму гледачу, у тым ліку і моладзі, такія відовішчы, якімі ён быў-бы здаволен. У асноўным ён дасягае сваёй мэты. Самі-ж гледачы кажуць, што мы на 95 проц. здавальняем іх запатрабаваньні. Нельга абвінавачваць БДТ, што ён дае мала пастановак з сучаснага жыцьця. У гэтым сэзоне мы паказалі цэлы шэраг п'ес сучаснай рэчавістасьці і з нядаўняга мінулага („Над Нёмнам“, „Перамога“ і г. д.).

Анішчук (пераплётчык). У асноўным спэктаклі БДТ задаволілі моладзь; толькі трэба падкрэсьліць, што яны **мала адбіваюць сучасныя падзеі**. Трэба паставіць перад нашымі літорганізацыямі пытаньне аб стварэньні п'ес, якія-б малявалі жыцьцё і працу моладзі, яе ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве і г. д. Вось што патрэбна нам у першую чаргу!

Тэатр да моладзі, моладзь да тэатру!

Рубенчык (Горрайком ЛКСМБ). За апошні час моладзь стала частым госьцем тэатру і мае права патрабаваць, каб пастаноўкі апошняга былі да яе прыстасаваны. З свайго боку БДТ павінен ісьці насустрач маладому гледачу, улічваць яго запатрабаваньні.

У далейшым, **наведваньне тэатру моладзьдзю павінна стаць не выпадковым, а сыстэматычным, трэба яшчэ больш прыблізіць моладзь да тэатру і, наадварот, тэатр да моладзі.**

Пры належнай увазе комсамольскіх ячэек да гэтага пытаньня, тэатр зможа адыграць значную ролю ў справе выхаваньня моладзі, адцягне кой-каго, ад хуліганства, п'янства і інш. „карысных“ занятказў.

Ня трэба шаблёну!

Гольдбэрг („Чырвоная Зьмена“). Наша асноўнае запатрабаваньне ад тэатру наступнае: бліжэй да рэальнага жыцьця!

Некаторыя моманты ў пастаноўках, як, напрыклад, вёска, сяляне, паны, рабочыя і інш., **занадта шаблённы і ненатуральны.** Калі сяляне—дык абавязкова скачуць Лявоніху, паны абавязкова злыя, як сабакі і г. д.

Артысты, рэжысэры, драматургі павінны быць цесна зьвязаны з масамі, ісьці ў рабочыя клюбы, у вёску, каб ведаць жыцьцё і не адрывацца ад сучаснасьці.

Белдзяржтэатр у асноўным стаіць на правільным шляху, але ён покуль што недастаткова чулы і слаба адгукаецца на сучасную рэчавістасьць. Чарговай задачай БДТ павінна стаць абагачэньне свайго рэпэртуару новымі мастацкімі пастаноўкамі.

Пабольш рэальнасьці, больш чуласьці да жыцьця—вось чаго мы павінны патрабаваць ад працаўнікоў БДТ!

* * *

З тэй прычыны, што ўжо быў позьні час, а запісалася для ўдзелу ў спрэчках шмат народу, **дыспут парашылі працягнуць у панядзелак 16-га мая.**

Білеты на працяг дыспуту можна атрымаць у клюбе імя КІМ і ў рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“.

Усебеларускія курсы ізбачоў.

Пачаўся прыем на ўсебеларускія курсы ізбачоў, якія адчыняюцца 15-га чэрвеня г. г.

Курсы разьлічаны на 100 чал. Прымацца на іх будуць, у першую чаргу, працаўнікі хат-чытальняў з практычным стажам.

Тэрмін заняткаў курсаў—трохмесячны.

Піонэр--фізкультурнік

Менакрбюро ЮП зацьвердзіла праграму заняткаў па фізкультуры, ў піонэрскіх атрадах Менскай акругі на летні пэрыод 1927 г.

Згодна праграмы, **кожны атрад павінен быць прымацованы да спортпляцоўкі, дзе і праводзіць заняткі не радзей 2-х разоў на тыдзень.**

У працягу летняга пэрыоду атрад павінен **рабіць вылазкі за горад не радзей аднаго разу** на 2 тыдні..

У працягу ўсяго лета належыць **популярызаваць** сярод піонэраў гімнастыку.

Павінна быць зьвернута асаблівая ўвага на скарыстаньне ўсіх летніх магчымасьцяй у мэтах аздараўленьня піонэраў.

У дапамогу павадыру атрада.

ЦБ прымацавала членаў бюро ЦК ЛКСМ і прэзыдыуму ЦБ ЮП да асобных атрадаў з мэтай іх практычнай дапамогі павадырам атрадаў: вывучэньня вопыту піонэрработы.

На масавым шахтурніры.

Практыкі—добрыя, тэорэтыкі--слабыя.

У закончыўшыхся групавых спаборніцтвах **масавага шахматнага турніру працоўнай моладзі** прымала ўдзел усяго 260 чалавек (25 сталых груп і адна дабавачная). З іх рабочай моладзі—86 чал. (33,3 проц.), служачай—18 чал. (7 проц.), чырвонаармейцаў—30 чал. (11,5 проц.), саматужнікаў—11 чал. (4,2 проц.), сялянскіх хлапцоў—2 чал. (0,8 проц.) і вучняў—112 чал. (43,2 проц.).



Самы маленькі ўдзельнік турніру піонэр Каган.

Партыйцаў прымала ўдзел у турніры 10 чал., комсамольцаў—44 чал., піонэраў—8.

Па «шахматнаму стажу» у турніры ўдзельнічала 81 чал., якія гуляюць ня больш году, 108—ад 1 году да 3-х, 58—ад 3-х да 5-ці і 13—звыш 5 год.

Лепшыя вынікі паказала служачая і рабочая моладзь. З першых у склад турніру пераможнікаў увашоў 21 проц., з другіх—19 проц. Затым ідуць вучні—18 проц., саматужнікі--13 проц., чырвонаармейцы—4 проц.

Турнір выявіў шахматныя сілы моладзі Менску, як у колькасных, так і ў якасных адносінах.

Гульня маладых шахматыстых у агульным добрая. Нярэдка здараліся вельмі прыгожа праведзеныя комбінацыйныя партыі. **Але адначасова трэба адзначыць, што большасьць гуляючых мала знаёма з тэорыяй шахматнай гульні, ад чаго ўзровень апошняй на турніры быў значна ніжэй, чым гэта можна было чакаць.**

Турнір прашоў вельмі ажыўлена і, бясспрэчна, прынёс вялікую карысьць у справе разьвіцьця шахматнай прапаганды сярод працоўнай моладзі.

12-га мая **пачаўся турнір пераможнікаў.**

Хто ўвайшоў у турнір пераможнікаў

Ранішняя зьмена: Мазель, Лур'е, Трэсман, Файн, Драпкін (першая група); Татур, Шусэр, Будоль, Гардон С., Івянскі (другая група); Дакшыцкі, Штэйн, Шапіра, Нагорны, Кісін (трэцяя група).

Вячэрняя зьмена: Дакшыцкі А., Лабадзінскі, Вакштэйн, Новыш, Малкес, (чацьвёртая група); Хігеровіч, Кобац, Шэвельман, Гораховскі, Быліна, Батвінік (пятая група); Войтак, Іванаў, Ліс, Ліхачоў, Гадуйка (шостая група); Кацнельсон, Насьцюшонак, Эпштэйн, Ліўшыц, Лейкін (сёмая група); Левін, Мазэляў, Клімбоцкі, Ляскоў, Кантаровіч. Эцін (восьмая група); Ліўшыц А., Скакоўскі, Лапідус, Шафір, Цярэнцяў (дзевятая група); Пішчака, Левін С. Розэнблюм, Гардон Г., Ламдзін (дзесятая група).

Узяў конкурс!

Комсамолец Файгэнбаўм сабраў 55 трохмесячных падпісчыкаў „Зьмены“—Ён дармова залічан у склад экскурсантаў.

Файгэнбаўм А. — комсамолец ячэйкі Наркамюсту выконвае абавязкі ўпаўнаважанага па друку.

Даведаўшыся з «Чырвонай Зьмены» аб тым, што сабраўшы 45 трохмесячных падпісчыкаў на «Чырвоную Зьмену», можна дармова паехаць на экскурсыю па маршруту Ленінград—Волхаўбуд—Кранштат, Файгэнбаўм парашыў узяцца рашуча за працу.

Вярбоўку падпісчыкаў праводзіў ён сярод комсамольцаў сваёй ячэйкі, партыйцаў, піонэраў і беспартыйных супрацоўнікаў Наркамюсту.

З кожным днём колькасьць трохмесячных падпісчыкаў расла. 20...25...40... і ўрэшце ў адзін прыгожы дзень Файгэнбаўм, прышоўшы дамоў, з аблягчэньнем уздыхнуў...**У яго ўжо было 45трохмесячных падпісчыкаў!** Але на гэтым ён ня спыніўся. **Да дню ад'езду экскурсыі ён набраў ужо 55 падпісчыкаў.**

І вось учора разам з экскурсыяй **тав. Файгэнбаўм** за лік Выдавецтва **«Чырвоная Зьмена» пакаціў у Ленінград.**

Р.



Экскурсанту сьніцца Ленінград.

Краіна--аўтамат

У Нью-Ёрку на аднэй з самых галоўных вуліц знаходзіцца вялічэзны будынак, у якім зьмяшчаецца **„Акцыянэрнае амэрыканскае вобчаства па шпаркай пабудове дамоў“:**

Хто-небудзь хоча купіць дачу недалёка ад Нью-Ёрку. Ён ідзе ў гэта акцыянэрнае вобчаства. Яму паказваюць фотографіі розных па вялічыне дач, а таксама мініятурныя мадэлі. Назначаецца цана. Дасцца адзін дзень на агляд зямлі. Сашліся ў цане. Умова заключана і падпісваецца кантракт...

Тут пачынаецца дзіўная казка.

Сёньня быў падпісан кантракт, а праз два дні пакупацель атрымоўвае абвестку з просьбай паехаць аглядзець.. гатовую дачу.

Уся гісторыя пягнулася два дні. Да месца вызначанага для пабудовы, у працягу двух дзён пад'яжджалі вялізарныя грузавікі, нагружаныя разборнымі сьценамі, крышай, фундамантам і іншымі будаўнічымі прыладамі. Тутжа на месцы быў пракладзен гатовы бэтонны фундамант. Дом сабралі. І пакупацель можа... уяжджаць!

Калі па ўмове дача прадавалася з садам, то ў часе пабудовы спэцыяльныя садоўнікі, служачыя таго-ж вобчаства, пераносяць туды сапраўдную аранжарэю—і ўсё закончана. Дача—ў два дні!

Хай чытач ня думае, што гэта адносіцца толькі да невялікіх дач.

Гэта-ж самае вобчаства **прымае і выконвае заказы на самыя вялікія будынкі, на цэрквы і нават саборы.** У такім выпадку патрабуецца некалькі дзён на пабудову самага фундаманту, ні вярней не на пабудову, а на пракладку яго, таму што ўсякай вялічыні фундаманты ўжо гатовы. Зборы частак дому займаюць вельмі мала часу і можна быць упэўненым, што самае позьняе праз месяц—дом будзе ўсім закончан.

Праз два тыдні пасьля сьмерці прэзыдэнта Гардзінга была пабудавана царква яго імя, якая ўмяшчае 600 чалавек.

Вось яшчэ адзін варты ўвагі **факт**, абсалютнай аўтаматызацыі Амэрыкі.

У тым-жа доме, дзе зьмяшчаецца „Акцыянэрнае вобчаства па шпаркай пабудове дамоў“, існуе на другім паверсе вялікая кантора пад шыльдай **„Літаратурнае і музычнае таварыства“.** На шыльдзе надпіс амаль на ўсіх мовах: **„Тут купляюцца і прадаюцца газэтныя, драматычныя, музычныя і літаратурныя тэмы“.**

Калі чытаеш гэты надпіс, дык ня верыш сваім вачам і задаеш сабе пытаньне:—„Што гэта за ерась?“.

Не, аказваецца гэта ня ерась. У гэтай канторы прадаюцца тэмы для артыкулаў, кніг, музычных твораў і нават будучых опэраў.

Цэны на тэмы для раманаў існуюць ад 25 да 100 доляраў. Тэмы для газэтных артыкулаў ад 2-х і да 10 доляраў. Тэмы на фокстроты і лёгкую музыку ад 1-га да 500 доляраў, а на опэры цана даходзіць часам да 1000 доляраў!

Акрамя таго, тое-ж вобчаства прадае пачатак, сярэдзіну і аканчаньне раманаў, артыкулаў і музычных твораў. Цана хістаецца ў залежнасьці ад таленту, лёгкасьці і разьмеры твору.

Гэта вобчаства існуе каля пятнаццаці год. **Яно налічвае дзясяткі тысяч кліэнтаў, сярод якіх былі, як кажуць, Гэнры, Джэк Лёндан і іншыя буйныя амэрыканскія пісьменьнікі.**

Што „таварыства“ робіць бліскуючыя опэрацыі—можна бачыць з штогодняга балянсу. За 1926 год **чысты прыбытак выразіўся ў чатыры мільёны доляраў.**

І такіх кантор у Амэрыцы каля васьмідзесяці...

Ю. Б.

Адказы чытачам.

Персіцу (№ 229) Звычайны піонэрскі барабан можна купіць у магазыне МЦРК (рог Ленінскай і Плошчы Волі). Каштуе—17 руб., але ёсьць і лепшага сорту, якія каштуюць па 25 руб. Аб атрыманьні барабану ў крэдыт трэба дагаварыцца з праўленьнем МЦРК.

Штэйману (№ 930) Не абавязкова, каб прадстаўнік ад комсамольскай фракцыі прысутнічаў на экзамінах вучнёўскай групы.

Яму-ж (№ 931) Прадстаўнікі ад вучняў у педнараду карыстаюцца правам голасу пры разглядзе тых ці іншых пытаньняў.

Рыўкіну (№ 932) Чыгуначны тэхнікум існуе ў Менску. Прыём туды такі-ж як і ў другія тэхнікумы (на тых-жа ўмовах). Але ў першую чаргу прымаюцца туды сябры саюзу чыгуначнікаў і іх утрыманцы.

Яму-ж (№ 933) **Райком мае права забараніць організацыю той ці іншай вячоркі.**



У тры радкі

○ **Літаратурная камісія** Інбелкультуры падрыхтавала да друку **поўны збор твораў пісьменьніцы А. Цёткі.**

○ У Менскай акруговай бібліотэцы налічваецца **каля 25 тысяч кніг,** з якіх 20 проц. юнацкай і дзіцячай літаратуры.

○ Да 10—годзьдзя Кастрычнікавай Рэволюцыі Гістпарт ЦК КПБ выдае **шэраг кніжак, прысьвечаных гісторыі Кастрычніка на Беларусі.**

І старае зламалі і новага не пабудавалі.

(Віцебск).

Акругкомам комсамолу ў кастрычніку месяцы 1926 году была склікана першая гарадзкая конфэрэнцыя юнкораў нашага гораду. Тут абралі бюро юнкораў, якое потым праводзіла ўсю працу сярод юнкораў. Быў падрыхтаваны сэмінары для падрыхтоўкі кіраўнікоў юнкораўскіх гурткоў. Наладжвалася сталая праца сярод дзяткораў. Потым распусьцілі бюро і гэтая праца заняпала. Камісія па друку, створаная акругкомам, нічога не рабіла, яе таксама распусьцілі.

Сярод юнкораў ніякай працы ня вядзецца. Сэмінары кіраўнікоў юнкораўскіх гурткоў не працуе. Няма юнкораўскага актыву. Акругком зрабіў так: і старое зламаў і новага не пабудаваў. Трэба над гэтым падумаць.

Л. Эйтынгін.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 2 друкарня БДВ. Тыраж у ліку 3600 экз.